«Шматгалоссе творчых людзей»

Гуманітарнаму праекту «Мінская ініцыятыва» ўжо чатыры гады. Калісьці, разумеючы небяспеку разрыву культурных сувязяў паміж трыма сяброўскімі краінамі, прадстаўнікі Беларусі, Украіны і Расіі сабраліся ў беларускай сталіцы, каб паспрабаваць папярэдзіць страту такіх каштоўных стасункаў. Было зразумела, што нягледзячы на розныя абставіны і складанасці ў палітычным жыцці, культурныя сувязі неабходна захоўваць! Іх добры намер сапраўды аказаўся плённы і ўжо прынёс першыя плады. Напрыканцы 2016 года свет пабачыў паэтычны альманах «Terra poetica». Яго прэзентацыі адбыліся спачатку ў Мінску, затым у Кіеве і ўрэшце на Міжнароднай кніжнай выставе ў Маскве. Канец 2017-га быў адзначаны яшчэ адной яскравай падзеяй — выхадам альманаха маладой прозы.

Марыяна КІЯЎНОЎСКАЯ (Украіна), Міхась БАШУРА (Беларусь) і Андрэй КАРОВІН (Расія).

Прэзентацыя празаічнай «Terra poetica» па традыцыі адбылася найперш у беларускай сталіцы. **Спецыяльны прадстаўнік прэзідэнта Расіі па міжнародным культурным супрацоўніцтве Міхаіл ШВЫДКОЙ,** які выступаў адным з вядучых прэзентацыі, растлумачыў:

— Мы прадстаўляем ужо другі альманах «Terra poetica», у ім сабраны кароткія празаічныя творы. Разам надрукаваныя тэксты на трох мовах — рускай, беларускай і ўкраінскай. Але не менш важна і тое, што аўтары, чые творы надрукаваныя пад адной вокладкай, неўзабаве пачнуць перакладаць адно аднаго — акурат так адбылося з удзельнікамі паэтычнага альманаха. Таму рускамоўны чытач, напрыклад, ужо пазнаёміўся і з новай рускай, і з новай беларускай паэзіяй. Можна спадзявацца, што і сустрэча празаікаў, якая адбылася ў Мінску, дасць штуршок да ўзаемных перакладаў, і што проза краін-суседак стане даступнай адна адной. На маю думку, гэта важна, бо сапраўды зразумець, што адбываецца ў суседняй краіне, нават у блізкай, можна найперш праз літаратуру. І нават больш, чым праз медыя, якія толькі фіксуюць пэўныя падзеі, што адбываюцца на паверхні. А глыбінныя працэсы адбываюцца на зусім іншым узроўні — акурат пра гэта і пішуць літаратары.

Прэзентацыя альманаха «Terra poetica» праходзіла на розных узроўнях. Адбываліся сустрэчы ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі, Беларускім дзяржаўным універсітэце. Быў час для свабоднага кантактавання маладых творцаў, куратараў і іншых удзельнікаў праекта. Абмяркоўвалі і далейшыя планы. Бо акрамя прэзентацыі паэтычнага альманаха летась быў праведзены мастацкі пленэр, вынікам якога стала выстава «Тры Сафіі». Таксама рэалізуецца ідэя тэатра для дзяцей з асаблівасцямі. У сакавіку пастаноўку плануюць прадставіць гледачам.

Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман МАТУЛЬСКІ падзяліўся сваімі ўражаннямі ад работы «Мінскай ініцыятывы»:

— Для мяне асабіста надзвычай прыемна, што «Мінская ініцыятыва» чарговы раз збіраецца менавіта ў Нацыянальнай бібліятэцы... Важна, што ў праекце прымае ўдзел моладзь з трох краін. Яны з'ездзілі адзін да аднаго і дакладна памянялі свае погляды — я ўпэўнены, сталі сябрамі! Таму выніковая каштоўнасць такіх сустрэч надзвычай высокая.

Варта адзначыць, што наступны альманах, па папярэдняй задуме, будзе прысвечаны дзіцячай літаратурнай творчасці. Ёсць верагоднасць і таго, што ён можа быць прысвечаны літаратурнай крытыцы.

Цікавай часткай міжнародных сустрэч у беларускай сталіцы стаў перакладчыцкі семінар, арганізаваны **рэдактарам аддзела паэзіі літаратурнага часопіса «Дружба народов» Галінай КЛІМАВАЙ.** Маладыя паэты, знаходзячыся дома, зрабілі пераклады двух вершаў украінскага паэта Васіля Стуса на свае мовы, карыстаючыся спецыяльна падрыхтаванымі для іх падрадкоўнікамі. А на семінары ў Мінску ў іх была магчымасць супольна абмеркаваць вынікі сваёй працы, паспрабаваць заўважыць моцныя і слабыя бакі перакладаў, зробленых іншымі аўтарамі, тым самым істотна ўзбагаціць свой паэтычны і перакладчыцкі досвед.

І як **перакладчыца,** і як **празаік з Украіны** завітала **Марыяна КІЯЎНОЎСКАЯ.** Яна заўважыла:

— Мне здаецца, што «Terra poetica» — праект, які засяроджаны на будучыні. Было надзвычай цікава чытаць творы, якія ўвайшлі ў празаічны альманах. Яны ўразілі сваёй пранізлівасцю. Цікавым было і тое, што наратывы аўтараў з розных краін перагукаюцца паміж сабой. Яны гавораць пра адны і тыя ж рэчы: пра работу памяці, пра барацьбу за сваю ідэнтычнасць. Нават калі гэта ідэнтычнасць вымяраецца пакуль што пэўнай нявызначанасцю, нават катарсісам. У тэкстах розных аўтараў вельмі шмат перагукванняў. І вельмі хочацца, каб гэтая лучнасць захоўвалася і надалей.

Альманах быў надрукаваны ва ўкраінскім выдавецтве «Саміт-кніга» накладам 1500 асобнікаў. Яго рэдактарамі-складальнікамі выступілі ўкраінская літаратарка Леся Мудрак, а таксама **расійскі паэт, пісьменнік, арганізатар паэтычных фестываляў Андрэй КАРОВІН,** які расказаў:

— Разам з Лесяй Мудрак мы даволі доўга прадумвалі гэты нумар. І пэўны час разважалі над тым, хто такія маладыя празаікі з пункту гледжання ўзросту. Я прытрымліваўся меркавання, што празаікі фарміруюцца пазней. Таму, калі, напрыклад, маладыя паэты — гэта людзі да 35 гадоў — але і з гэтай лічбай я не да канца згодны, хоць яна і стала агульнапрынятай. Для празаікаў узроставае абмежаванне трэба падняць. У нашым альманаху мы давялі яго да 40 гадоў — аднак і гэта, на маю думку, празаікі-немаўляты. Маладымі празаікамі можна лічыць людзей 45—50 гадоў. А тым, хто ўжо адбыўся як літаратар, можа быць і 90.

Пра што распавядаюць маладыя празаікі?

Цікавымі разважаннямі ва ўступным слове да альманаха падзяліўся **дырэктар украінскага Нацыянальнага музея Тараса Шаўчэнкі Дзмітрый СТУС:**

У нашым жыцці стала цесна ад палітыкі. Ці ад ілюзіі палітыкі? Хіба ў палітыцы сканцэнтраваны ўсе праблемы людскога быцця? Так бывала ўжо не раз: замест радасці, любові, сяброўства — асуджэнне, супярэчнасці, недавер і разлад, што ўсё мацней раздзяляюць і адчужаюць людзей і народы. Падчас разладаў цяжка не замкнуцца, прымусіць сябе прыслухоўвацца да свету і пастарацца пачуць у гомане напаленай варожасці жывыя галасы... Мы жывём у перыяд сацыякультурных трансфармацый, калі пошук шляху суправаджаецца высокай верагоднасцю памылкі. І таму патрэбна і важна чуць шматгалоссе творчых людзей, закліканых перадаць думку і праўду іншага — іншага чалавека, іншага народа, суседа па доме ці па краіне. Не для таго, каб прыняць яе, але хоць бы зразумець...

Думаецца, гэта надзвычай важныя словы, дзе не проста расстаўлены важныя акцэнты, у іх быццам бы падабраны ключы да сапраўднага сяброўства, у якім могуць удзельнічаць раўназначныя асобы, што не заўсёды падзяляюць погляды адно аднаго. Затое імкнуцца пачуць. І проста прыняць іншага такім, які ён ёсць.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
nina@zviazda.by

ОАО «Гомельоблреклама» извещает о проведении 26 января 2018 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 20% после несостоявшихся торгов по продаже имущества в 11.00 в г. Гомеле по ул. Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества одним лотом, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Информация о земельном участке: кадастровый номер **340100000006004802 площадью 0,1849 га** – для эксплуатации и обслуживания административного здания. **Местонахождение:** Гомельская область, г. Гомель, ул. Борисенко, д. 7		
1	**Капитальное строение с инв. № 350/С-42584, общей площадью 1 616,7 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административный корпус.** Составные части и принадлежности: **галерея.** Забор железобетонный – **36,0 м. п.** (инв. № 114), озеленение (7 деревьев) (инв. № 13), вертикальные планировки и благоустройство (инв. № 12), в т. ч.: проезжая часть – **632,0 кв. м**, борты – **42,0 кв. м**; распределительные пункты ПР – 3 шт. (инв. №37); распредустройство – 3 шт. (инв. № 32)	266 512,00	13 325,60

Продавец: ОАО «Гомельоблреклама», г. Гомель, ул. Гагарина, 20. **Организатор торгов**: филиал «Эксперт-Услуга» ОАО «Гомельоблреклама». Конт. тел.: 8 (029) 694-43-89, 8 (0232) 23-23-53 – Грачева Полина Станиславовна. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца имущества (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY34-BAPB30122093700130000000, БИК BAPBBY23912, Филиал ОАО «Белагропромбанк» ГОУ, УНП 400071204,ОКПО 285728963000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 11 января 2018 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00 **прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 24 января 2018 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только **единственным** участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом имущества** в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договора купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. **В соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь может быть предоставлена рассрочка оплаты имущества**. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Подробное извещение о первых торгах опубликовано в газете «Звязда» от 29.11.2017 г. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы»**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5
Продавец	ОАО «СМТ № 41», Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Гагарина, д. 24

Предмет аукциона

Месторасположение: Гродненская область, г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, д. 19, 19/3, 19/6, 19/7, 23, 19/10

Наименование	Назначение	Инвентарный номер	Общая площадь
Административно-бытовой корпус ЖБИ	Здание административно-хозяйственное	443/С-21218	1244,6
Арматурный цех (без оборудования)	Здание специализированное для производства строительных материалов	443/С-13727	3187
БСЦ ЖБИ	Здание специализированное для производства строительных материалов	443/С-21219	729,3
Составные части и принадлежности	Галерея (а)		
Полигон	Сооружение неустановленного назначения	443/С-21204	562
Составные части и принадлежности	Железобетонные пропарочные камеры (а, б, в)		
Склад готовой продукции (без оборудования)	Сооружение специализированное складов, хранилищ	443/С-21205	2565,5
Склад металла	Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	443/С-21206	1195,9
Формовочный цех (без оборудования)	Здание специализированное для производства строительных материалов	443/С-13718	2418,9
Составные части и принадлежности	Очистные сооружения (а)		
Административно-бытовой корпус ЗТБ	Здание административно-хозяйственное	443/С-13715	793
Составные части и принадлежности	Подвал (А3/к), забор, ворота, кирпичная уборная (1)		
Автодороги	Сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства	443/С-21202	15812
Составные части и принадлежности	Дорожное полотно (а1, а2, а3, а4, а5, а6, а7, а8, а9)		
Бетоносмесильный цех (без оборудования)	Здание специализированное для производства строительных материалов	443/С-13713	792,3
Составные части и принадлежности	Галерея (а)		
Открытый склад заполнителей	Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	443/С-13719	276,5
Проходная	Здание нежилое	443/С-13742	17,9
Склад цемента (без оборудования)	Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	443/С-13735	497,2
Составные части и принадлежности	Подвал (А1-2/к), рампа		
Комплексная трансформаторная подстанция (без оборудования)	Здание специализированное энергетики	443/С-21203	73,1
Компрессорная (без оборудования)	Здание специализированное для производства строительных материалов	443/С-13733	312,4
Составные части и принадлежности	Подвал (А1/кп)		
Закрытый склад заполнителей	Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	443/С-13734	325,5

Сведения о земельном участке: предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений завода железобетонных изделий площадью 10,6793 га с установленными ограничениями (обременениями) в отношении недвижимого имущества, находящегося в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадь – 0,1368 га

Начальная цена с НДС 20 % – 1 965 240,00 бел. руб. (снижена на 50 %)

Обременения – Договор аренды на арматурный цех, АБК ЗТБ

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

Срок подписания договора купли-продажи – **2** рабочих дня после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **5 (пяти) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 28.12.2017 г.**

Аукцион состоится 24.01.2018 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 22.01.2018 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by. Email: auction@cpo.by

ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНЫМ ДЕКЛАРАЦИЯМ по объекту «Застройка жилых кварталов с объектами социальной инфраструктуры в границах пр. Дзержинского – пр. Любимова – ул. Семашко (2-я очередь строительства). Жилой дом № 16 по генплану», опубликованным в газетах «Звязда» № 193 (28557) от 06.10.2017, № 245 (28609) от 20.12.2017

Действуют скидки на стоимость 1 кв. м общей площади для 20 (двадцати) квартир:

при единовременной оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв. м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную **100 (ста) долларам США**.

УНП 192400611